CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

# EGZAMIN MATURALNY
## OD ROKU SZKOLNEGO 2014/2015

# JĘZYK BIAŁORUSKI
## POZIOM ROZSZERZONY

**PRZYKŁADOWY ZESTAW ZADAŃ**

**Czas pracy: 180 minut**

**GRUDZIEŃ 2013**

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1.: На аснове дадзенага фрагмента тэксту прадстаў праблему і паразважай над ёй. Карыстайся тэзісам і думкамі аўтара і аднясіся да іншага тэксту культуры. Твая праца павінна налічваць не менш 300 слоў.**

Свабода – галоўная маральная і фізічная каштоўнасць, дадзеная кожнай жывой істоце ад нараджэння. Усё жывое і карыстаецца гэтай каштоўнасцю, наколькі магчыма ў складаным, заблытаным свеце натуральнага існавання. Акрамя хіба што чалавека, якому недастаткова дадзенай ад нараджэння свабоды. Каб у поўнай меры ўсвядоміць і адчуць яе неабходнасць, яму наканавана прайсці праз хітрасплятанні жыццёвага лабірынту. А то і заставацца ў адным з яго тупікоў. І звыкнуцца, зачахнуць, згубіць прыроджаны дар свабоды, прыладкавацца ў імя элементарных мэтаў біялагічнага існавання. Зрабіцца часткай натоўпу, грамадства, электарату – такім, як усе.

Але як быць асобе, калі яна выпадае з масы сабе падобных, калі гэта – мастак, якім рухае ўнутраны імпульс самавыяўлення? Як перадолець жывёльную залежнасць ад соцыюму, які непазбежна нівэлюе Богам дадзены дар? Ці, можа, не трэба нічога пераадольваць, а падладзіцца, прыладкавацца, каб дасягнуць бесканфліктнага існавання? Дзесяцігоддзямі ў нашых вушах гучала рабская максыма: “Жыць у грамадстве і быць свабодным ад грамадства нельга”. Сапраўды нельга, не дадуць, не дазволяць. Тыя, ад каго гэта залежыць, натхняюцца не падманлівай ідэяй чалавечай свабоды, а рэальнай патрэбай ўціску і сілы. І, праўда, яны валодаюць немалой сілай, бо яны – заўсёды ў большасьці.

Можа, сапраўды, каб выжыць, варта аб’ядноўвацца, збіцца ў зграю, як робяць многія істоты ў жывой прыродзе. Асабліва калі ёсць ідэя – неістотна, добрая ці благая. Часам ідэя вызначаецца інстынктам нацыі ці клясу, ці нейкай групы, і тады свет аказваецца перад імпэрскай, пралетарскай, нацысцкай ідэямі, праз якія заўсёды ліецца кроў. Апантанасць так званымі папулісцкімі ідэямі каштуе вялікай крыві. І яны рэдка ажыццяўляюцца. Нават самая свята з іх – ідэя свабоды.

В. Быкаў, *Доўгая дарога дадому, http://www.bykau.info/articles/by11.htm*

**Тэма 2.: Зрабі параўнаўчы аналіз і інтэрпрэтацыю вершаў. Твая праца павінна налічваць не менш 300 слоў.**

Максім Багдановіч

***Раманс***

Quand luira cette etoile,
La plus belle et la plus lointaine,
Dites-lui qu'elle eut mon amour,
O dernieres de la race humaine.

*Sully-Prudhomme**

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла…
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
У неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
У сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.
Глянь іншы раз на яе,– у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае…
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе…

---

* Калі аднойчы засвеціцца гэтая зорка,
Найпрыгажэйшая і найдалейшая,
Скажыце ёй, што я кахаў яе,
О, апошнія з роду людскога.
Сюлі-Прудом (фр.)

М. Багдановіч, *Раманс*, [у:] *Поўны збор твораў*, Мінск 1992, Т. I, ст. 77–78.

Сяргей Грахоўскі

***Першае каханне***

Я першую каханую сваю
Не зваў на «ты», не цалаваў, не песціў,
Я рады быў, што побач пастаю,
І сам не свой ішоў на тое ж месца.

Дзе толькі што смяялася яна,
Дзе толькі што яе ляжалі рукі.
І першага кахання навіна
Была пачаткам радасці і мукі.

Я сніў яе, а потым, як у сне,
Убачыў: каля нашага паркана
Яна ішла, мінаючы мяне,
Не бачачы, што побач закаханы.

Яна прайшла, як сонечны прамень,
Над часам, над разлукай, над вайною.
У самы цяжкі і суровы дзень
Яна была, здавалася, са мною.

Я думаў: ёй заўжды семнаццаць год,
Яна ў сне ўяўлялася такою,
Што ад вачэй любы растане лёд
І сэрца больш не будзе мець спакою.

І вось сустрэў каханую сваю:
Знёмы твар, але патухлі вочы;
Не, гэта не яна, яе не пазнаю,
Як вершы, што чытаў мінулай ноччу.

С. Грахоўскі, *Першае каханне*, [у:] *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя*, В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, Варшава 2001, ст. 214.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr …………**

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

.....................................................................................................................................................

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*